Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка

Тушынскі Дз.М.

Хуткачытанне як працэс рацыянальнага чытання
Памятка да занятку па курсе “Практычная псіхалінгвістыка”

Хуткачытанне – *гэта суцэльнае чытанне тэксту, якое забяспечвае поўнае і якаснае засваенне прачытанага, якое ажыццяўляецца нетрадыцыйнымі метадамі.* Звярніце ўвагу на тое, што галоўная мэта метаду – не хуткасць (якая разглядаецца як дадатковы вынік), а менавіта якасць разумення. Гэты метад карыстаецца законамі псіхафізіялогіі для выбірання інфармацыі з тэкстаў, што забяспечвае высакаякаснае разуменне.

Для разумення сутнасці працэсаў хуткачытання карысна прадставіць працэс чытання ў якасці алгарытму з некалькіх блокаў. Інфармацыю ўспрымае блок зрокавага аналізатару, яна апрацоўваецца пры дапамозе маўленчарухальнага, маўленчаслыхавага і сэнсавага блокаў. Вынік працы апошняга – разуменне – прадстаўлена ў памяці. Існуе таксама блок кіравання, які кантралюе працу мышцы вачэй, рук, языка, губ.

Чытач ахоплівае поглядам пэўны фрагмент тэксту, які апрацоўваецца ў зрокавым, маўленчарухальным, маўленчаслыхавым аналізатарах. У выніку апрацоўкі сэнсавы блок (ён жа – блок прыняцця рашэння) дае каманду аб чытанні далейшага фрагменту або аб рэгрэсіі і перачытванні ў выпадку недастатковага разумення.

Адзначаецца, што такая паслядоўная апрацоўка інфармацыі нерацыянальна, бо важныя для разумення пункты размеркаваны па ўсім тэксце, усё астатняе – больш ці менш залішняя інфармацыя.

Адзначаюцца наступныя недахопы традыцыйнага чытання.

1. **Артыкуляцыя.** Пры чытанні мікрарухі органаў маўлення замаруджаны толькі знешне, на сам рэч яны актыўны. Чым болей напрактыкаваны чытач, тым меней актыўны ў яго органы маўлення пары чытанні. Звычка прагаворваць тэкст (свядома ці падсвядома) фарміруецца ў дзяцінстве, у выніку чаго паміж зрокавым і слыхавым вобразамі слова ствараецца рэфлекторная сувязь. Мэта практыкаванняў на хуткачытанне – разрыў гэтай сувязі.
2. **Недастатковае поле зроку.** Пад полем зроку разумеюць фрагмент тэксту, які дакладна ўспрымаецца пры адной фіксацыі зроку. Пры традыцыйным чытанні яно складае 2-3 словы, што вельмі мала і выклікае шмат спыненняў і затрымак. Чытанне, пры якім за адну фіксацыю ўспрымаецца цэлая фраза або радок мае шэраг перавагаў: яно хутчэйшае, яно спрыяе ўзнікненню вобразных уяўленняў на аснове фразы, якія, ў сваю чаргу, праясняюць сэнс. Зніжаюць хуткасць чытання і пераходы погляду ад канца папярэдняга радка да пачатку наступнага.
3. **Рэгрэсіі.** Рэгрэсіі – гэта вяртанні погляду назад, да ўжо прачытанага фрагменту. Найчасцей яны не патрэбны, бо далейшае чытанне здымае ўзнікшыя пытанні і недастатковае разуменне.
4. **Адсутнасць стратэгіі чытання.**
5. **Адсутнасць увагі.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адпаведна недахопам прапануюцца шляхі іх ліквідацыі.

Скарачэнне артыкуляцыі пры чытанні. Існуе шэраг метадаў затрымкі артыкуляцыі. Напрыклад, эксперыментальна ўжываўся метад утрымання языка адмысловай пласцінкай або проста зубамі. М. І. Жынкін прапанаваў метад "цэнтральных маўленчых перашкодаў", пры якім чытач выстуквае рытм, які не адпавядае тэмпу стандартнага маўлення на роднай мове. Рытм гэты, па сутнасці, мусіць быць арытмічным, што будзе збіваць рытмічную артыкуляцыю пры чытанні. Фізіялагічным падмуркам метаду ёсць пэўныя ўласцівасці працы галаўнога мозгу. Мяркуецца, што дзейнасць пры дапамозе рук цалкам загружае маўленчарухальны аналізатар і ён ня здольны ажыццяўляць адпаведны аналіз тэксту. Такім чынам, адбываецца чытанне без артыкуляцыі.

Рытм выстукваецца цвёрда і упэўнена, ўдарамі ў адну кропку, рухам усёй рукі. Галоўнае забяспечыць непарыўнасць рытмічнага малюнку. (Ляўшы выстукваюць двума рукамі бо ў іх маўленчая маторная зона – зона Брака – знаходзіцца ў абодвух паўшар'ях).

Аптымізацыя рухаў вачэй пры чытанні. Для павялічэння хуткасці чытання неабходна скараціць колькасць фіксацый погляду і іх працягласць, скараціць колькасць рэгрэсій, павялічыць колькасць слоў, якія ўспрымаюцца за адну фіксацыю.

Для гэтага неабходна развіць навык перыферычнага зроку, то бок павялічыць поле зроку. Даследаванні паказваюць, што гэтага рэальна дасягнуць шляхам адмысловай трэніроўкі на аб'ектах, якія вымагаюць канцэнтрацыі погляду ў іх цэнтры, пры гэтым адзінкі інфармацыі якіх размешчаны на досыць вялікай плошчы. Такімі аб'ектамі могуць быць табліцы Шультэ, пірамідкі або ромбы з лічбамі па баках і інш.

Для скарачэння колькасці рэгрэсій пасля чытання кожнага радку, яго закрываюць. Паступова гэта тэхніка прыводзіць да ўзнікнення стэрэатыпу чытання, пры якім погляд не вяртаецца назад. Пасля ўзнікнення ўстойлівага стэрэатыпу, папярэднія радкі можна ўжо не закрываць.

Як вядома, пры чытанні найбольшая колькасць фіксацый прыпадае на сэнсавыя апоры – ключавыя словы тэксту. Статыстычна, іх колькасць аднолькава па абодва бакі ад умоўнай рысы, якую можна правесці пасярэдзіне любой старонкі з тэкстам. Такім чынам, лічыцца, што чытанне шляхам фіксацыі погляду на сярэдзіне старонкі будзе найбольш эфектыўным. Чытанне вертыкальным рухам вачэй – не самамэта. Галоўнае, што пры дапамозе гэтага метаду за адзінку часу ўспрымаецца найбольшая колькасць інфармацыі.

Неабходна адзначыць, што ў такім кароткім нарысе не разглядаецца сама методыка трэніроўкі і тыпалогія практыкаванняў. Застаўся без увагі і аспект аўтагеннай трэніроўкі пры чытанні. Важна адзначыць, што навыкі хуткачытання хутка не дасягаюцца. Звычайна патрабуецца некалькі месяцаў рэгулярнай трэніроўкі.

P. S. Пытанні стратэгіі чытання і ўвагі разабраны ў асобных нарысах.

Тэст “Як Вы чытаеце?”

1. Ці заўсёды Вы, пачынаючы чытанне маеце дакладную мэту і матыў?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заўсёды дакладная мэта і матыў ……10
Заўсёды прыблізна і без матыву ……..6
калі-нікалі……..4
Зрэдку……..2
Ніколі……...0

2. Ці змяняеце Вы хуткасць чытання пад час чытання аднаго артыкулу
Увесь час ……10
калі-нікалі…….6
Вызначаю хуткасць перад пачаткам чытання……4
Заўсёды чытаю з сярэдняй хуткасцю……..2
Заўсёды чытаю марудна……0

3. Ці атрымліваецца цалкам засяродзіцца на тэксце?
Так, заўсёды……10
У асноўным так……6
Так, калі матэрыял цікавы……4
Зрэдку……2
Ніколі не атрымліваецца……0

4. Ці здольны Вы хутка зразумець структуру тэксту, які чытаеце?
Так, заўсёды……..10
Заўсёды разумею, якія раздзелы найбольш важныя……..6
Пасля чытання невялікай часткі ўжо ўяўляю сябе структуру……...4
Разбіраюся ў структуры пасля прачытання ўсяго тэксту……...2
Не звяртаў ўвагі на структуру……0

5. Ці можаце Вы адразу зразумець сэнс цэлага сказу ці яго часткі?
Так, заўсёды……..10
Так, калі тэкст лёгкі……..6
калі-нікалі…….4
Зрэдку……2
Не……0

6. Ці звяртаецеся Вы позіркам да ўжо прачытаных частка тэксту?
Ніколі…….10
Так, калі ёсць незнаёмыя месцы……..6
Зрэдку, з-за неразумення словаў……..4
Так, калі не разумею сэнс тэксту…….2
Так, часта, па розных прычынах……..0

7. Ці праводзіце Вы па радку пальцам або алоўкам
Галава і рукі без рухаў……10
Калі –некалі рухаю галавой……6
Пры чытанні важных месцаў праводжу пальцам па тэксту…….4
Часта……...2

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заўсёды……...0

8. Ці прагаворваеце Вы ўслых або пра сябе тое, што чытаеце?
   Заўсёды чытаю моўчкі і не прагаворваю……10
   Не магу адказаць дакладна……6
   Вымаўляю асобныя (складаныя) словы……4
   Часта заўважаю, што прагаворваю……2
   Заўсёды прагаворваю……...0

9. Ці ўзнікаюць у Вас вобразныя ўяўленні таго, пра што Вы чытаеце?
   Так, заўсёды……10
   калі-нікалі……6
   Цяжка адказаць……..4
   Вельмі рэдка……...2
   Ніколі……...0

10. Як рухаюцца Вашы вочы пры чытанні?
    Вертыкальна, плаўна і хутка пасярэдзіне старонкі……10
    Зігзагамі ад раду да радку……..6
    Па дыяганалі……4
    З супынкамі на кожным радку……...2
    З супынкамі на кожным слове……0

Прафесійны чытач – 100 балаў,
чытач, які валодае хуткачытаннем – 70-80 балаў,
эрудзіраваны чытач – 40-50 балаў,
большасць чытачоў – 20-30 балаў.

Літаратура

1. Андреев О. Н., Хромов Л. Н. «Техника быстрого чтения». – Мн.: «Университетское», 1987.
2. Бородина В. А., Бородин С. М. «Учим … читать». – Л.: Лениздат, 1985.
3. Гроссов А. Я. «Как правильно читать и приобретать глубокие знания». – Донецк: «Лебедь», 1994.
4. Димнет Э «Искусство думать». – Мн.: Поппури, 1996.
5. Засорина Л. Н. «Организация практических занятий по интенсивному чтению». – М., 1987.
6. Кларк Ли «Техника быстрого чтения». – Мн.: Парадокс, 1999.Лезер Ф. «Рациональное чтение». – М.: «Педагогика», 1980.
7. Just M. A., Carpenter P. A. “The Psychology of Reading and Language Comprehension", 1987.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ